

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# І. С. Былінскі—старшыня Совета Народных Камісараў БССР

Былінскі Іван Сямёнавіч па нацыянальнасці беларус, нарадзіўся ў 1903 годзе ў в. Якубоўка, Улукоўскага сельсовета, Гомельскага раёна, у сям'і чыгуначніка.

Пасля заканчэння 6-класаў чыгуначнай школы, у 1920 годзе паступіў у чыгуначныя майстэрні; працаваў спачатку вучнем-слесарам, потым слесарам да 1927 года. У 1923 годзе тав. Былінскі ўступае ў рады комсамола, а ў 1926 годзе—у рады ВКП(б).

У 1927 годзе тав. Былінскі выбіраецца сакратаром комсамольскага калектыва на заводзе, потым сакратаром Залінейнага райкома комсамола ў г. Гомелі.

У 1928 годзе яго выбіраюць сакратаром Бабруйскага акружкома комсамола.

З 1929 па 1931 г. тав. Былінскі працуе намеснікам дырэктара Белсельбудтрэста. У 1931 годзе паступае на вучобу ў Гомельскі лесатэхнічны інстытут. Скончыў інстытут у 1936 годзе, атрымаўшы званне інжынера-лесатэхнолага першай ступені.

Пасля заканчэння інстытута працуе на Віцебскім фанерным заводзе — спачатку зменным майстрам цэха, а затым памочнікам галоўнага механіка завода.

З 1938 г. па 1939 г. працуе намеснікам упраўляючага Беларускім трэстам фанерна-запалкавай прамысловасці і затым упраўляючым Беларускім трэстам фанернай прамысловасці.

У 1939 годзе ЦК КП(б) Беларусі вылучае тав. Былінскага на адказны ўчастак работы ў апараце ЦК КП(б)Б—спачатку ў якасці інструктара, а потым загадчыка Аддзелам лясной прамысловасці ЦК КП(б)Б.

На абласной партыйнай канферэнцыі Палескай вобласці ў сакавіку месяцы 1940 года тав. Былінскі І. С. быў выбран першым сакратаром Палескага абкома КП(б)Б.

У час выбараў у Вярхоўны Совет БССР ад заходніх абласцей Беларусі працоўныя Ірысвяцкай выбарчай акругі, Відзоўскага раёна, Вілейскай вобласці, аднадушна выбіраюць вернага сына большэвіцкай партыі тав. І. С. Былінскага дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

На XVIII з'ездзе КП(б) Беларусі тав. Былінскі выбіраецца членам ЦК КП(б)Б і на другім пленуме ЦК КП(б)Б выбіраецца членам бюро ЦК КП(б)Б.

Усюды, куды партыя пасылае тав. Былінскага, ён з чэсцю змагаецца за справу Леніна—Сталіна.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Былінскі І. С. назначан старшынёю Совета Народных Камісараў БССР.